# «НАША НІВА» – НЕПАХІСНЫ ЗМАГАР ЗА БЕЛАРУШЧЫНУ

Бажанаў У.А.г. Минск, БНТУ

У грамадскім жыцці кожнага народа ёсць выдатныя ўзоры, калі друкаванае выданне станавілася сцягам барацьбы за светлыя, прагрэсіўныя мэты развіцця грамадства. «Современник» і «Колокол» у Расіі, «Федералист» у ЗША, «Друг народа» Марата ў Францыі абуджалі нацыянальную свядомасць народа, збіралі вакол сябе таленавітых і самаахвярных пісьменнікаў, публіцыстаў, палітыкаў, здольных ярка і таленавіта выказаць галоўныя ідэі грамадскага руху. У Беларусі ў гэтым шэрагу, безумоўна, знаходзіцца і першая масавая беларуская газета «Наша ніва», якая, по трапнаму вызначэнню вядомага беларускага гісторыка Міколы Ермаловіча, у гісторыі сусветнай прэсы з'яўляецца сваеасаблівым феноменам, таму што «мала знойдзецца газет, якія б усклалі на сябе паасобку цяжкія абавязкі арганізатара, настаўніка і правадыра выключна прыгнечанага народа» [3, с. 167]. Перагортваючы старонкі «Нашай нівы», бачыш панараму жыцця беларускага народа і ў вялікіх грамадска-палітычных здарэннях, і ў штодзённых клопатах беларусаў аб хлебе надзённым. Шматлікія карэспандэнцыі з усіх куткоў беларускай зямлі адлюстроўваюць характэрныя асаблівасці беларускага жыцця, яго супярэчнасці і вострыя праблемы. Толькі за першыя тры гады існавання «Нашай нівы» у ёй было надрукавана 900 карэспандэнцый з 489 вёсак, 260 вершаў 61 паэта і 96 апавяданняў 36 пісьменнікаў [2, с. 11]. Газета выстаяла ва ўмовах царскага тэрора пасля Першай рускай рэвалюцыі 1905–1907 гг., была папулярнай, запатрабаванай, таму што была цікавай для кожнага беларуса. З горыччу газета апавядала аб тых мярзотах, якімі было запоўнена бытавое жыццё народа, спрабавала навучать, настаўляць, раіць. Безумоўна, газета не была революцыйна наступальнай, адкрыта выкрывальнай у адносінах да дзяржаўнай улады, не звала мужыка «к топору». Але пасля рэвалюцыі, калі шмат яе ўдзельнікаў упалі ў тугу, перажывалі перыяд разброда і хістанняў, згубілі свае ідэалы,

Даклад асноўваецца на аналізе выпуска газеты «Наша ніва» за 1911 г., сабраным у выданні «Наша ніва». Першая беларуская газета з рысункамі. Вып. 4. 1911 г. Факсімільнае выданне. Вільня». Пры цытаванні з газеты захоўваюцца арыгінальны тэкст і арфаграфія.

«Наша ніва» знайшла вельмі патрэбны ў той час памяркоўны асветніцкі тон зносін з народам [1, с. 248], спакойна і спагадліва вяла з беларусамі размову аб важных жыццёвых акалічнасцях, зноў і зноў сцвярджаючы глыбокую веру ў здольнасть беларускага народа змяніць сваё жыццё да лепшага, стаць на ўзровень з іншымі нацыямі, і здарыцца гэта павінна на основе яднання народа як беларусаў. Вельмі трапна аб прынцыповай пазіцыі нашаніўцаў выказалася Т. Студзёнка: «Але з прычыны таго, што беларускі этнас знаходзіўся ў стане выключнай інэртнасці, бадай, адсутнасці культурнай і нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, размова першапачаткова павінна была ісці нават не аб *адраджэнні* як вызваленні ад уплыву з Захаду і Усходу, але аб элементарным абуджэнні: годнасці, гонару, духоўных і фізічных сіл…Менавіта неабходнасць абуджэння абумовіла адрасны пачатак «нашаніўства», прынцыповы зварот да нацыі, якая пастунова пачынае ўсведамляць сябе» [7, с. 111**].** Тым не менш, пры гэтым на сваіх старонках «Наша ніва» дэманстравала баявую прынцыповую пазіцыю ў адносінах да кансерватыўна-манархічных выданняў – праціўнікаў беларускага нацыянальнага адраджэння (часопіс «Крестьянин», газеты «Северо-западная жизнь», «Окраины России», «Россия», «Минское слово», «Віленскі веснік») у абароне сваіх поглядаў на пытанні разумення беларусаў як нацыі, ролі і месца беларускай мовы ў адукацыі, рэлігійных адносінах і іншых сферах грамадскага жыцця, перспектыў сацыяльна-культурнага равіцця Беларусі. І тут, трэба аддаць належнае, рэдакцыя праяўляла моцную ўпэўненасць, цвёрдасць, ні на ёту не адступаючы перад ціскам праўладных выданняў. За ўсе амаль 9 гадоў свайго існавання газета ні разу не пахіснулася, не здрадзіла сваёй вернасці беларускаму народу, яго еднасці і нацыянальнай годнасці. Таму лагічна, што характэрнай асаблівасцю беларускага нацыянальнага руху ў пачатку ХХ ст. з’яўлялася тое, што на працягу шэрагу гадоў ён развіваўся пад кіраўніцтвам, галоўным чынам, газеты «Наша ніва», пераемніцы ў гэтай ролі Беларускай сацыялістычнай грамады (леванародніцкай сялянскай партыі) [4, с. 435].

У гады паслярэвалюцыйнага спаду, калі многіх ахапіла пачуццё безвыхаднасці, ва ўмовах узмацніўшыхся паліцэйскіх рэпрэсій, вялікіх фінансавых і арганізацыйных цяжкасцяў, калі прыходзілася ратаваць газету і за ўласныя сродкі членаў рэдакцыі,

калі раз за разам улады канфіскоўвалі ўвесь тыраж асобных нумароў, штрафавалі рэдакцыю, а рэдактара і адначасова выдаўца Аляксандра Мікітавіча Уласава садзілі за краты за «імкненне да сепаратызму ў сэнсе захавання беларускай народнай самабытнасці і мовы», работа рэдакцыі, выпуск газеты былі, безумоўна, подзвігам плеяды яе кіраўнікоў, карэспандэнтаў, аўтараў. Гэта самаахвярная і слаўная старонка гісторыі развіцця беларускага нацыянальнага руху – выразны прыклад магутнага духу беларушчыны. І ці аб'ектыўна будзе абагульняць супярэчнасці, якія сустракаюцца ў газеце? «Наша ніва» вымушана была прыстасоўвацца да абставін, абмінаць вострыя вуглы, звяртацца да асцярожных выразаў. Газета праяўляла многа дыпламатычнага такту, асцярожнасці. Але, падкрэслім яшчэ раз, пазіцыя рэдакцыі прынцыпова заставалася нязменна прабеларускай, накіраванай на адраджэнне беларусаў як нацыі.

Газета бачыла сваю задачу ў тым, каб весці беларускі народ па «шляху спакойнай культурнай працы, стаўляючы перад яго вачыма гуманітарныя ідэалы агульналюдзскія» [5]. Пазней, у 1932 г., станоўчы погляд на ролю нашаніўцаў у адраджэнні Беларусі, існаваўшы яшчэ ў той час, настолькі раз’юшыў некаторых гісторыкаў–марксістаў, што яны палічылі, што ў рамках нарастаўшай жорсткай барацьбы з нацыянал-дэмакратамі актуальнай задачай стала развеяць, як яны казалі, «нашаніўскую легенду». З гэтай мэтай таварыства гісторыкаў-марксістаў Беларусі арганізавала дыскусію аб «Нашай ніве». Яе ўдзельнікі абвінавацілі нашаніўцаў у тым, што «абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларусаў, эканамічнае і культурнае «адраджэнне» Беларусі» яны лічылі сваімі галоўнымі задачамі і замест класавых прытрымліваліся інтарэсаў нацыі наогул. Нашаніўскі рух быў заклеймаваны як контррэвалюцыйны, нацыянальна-ліберальны, буржуазны. Было падкрэслена, што нашаніўскі рух рыхтаваў «кадры будучых азвярэлых ворагаў савецкай Беларусі» [2].

Аднак сярод вучоных-марксістаў не ўсе ўсё ж такі прытрымліваліся настолькі брыдкай ацэнкі дзейнасці «Нашай нівы». Наадварот, выказвалася меркаванне, што «уплыў нашаніўскіх ідэй быў настолькі вялікі, што рэшткі яго адчуваліся да апошняга часу нават сярод паасобных камуністаў, груп камуністаў і ў нашай літаратуры» [2, с. 58]. Дыскусія паказала, што аб “Нашай ніве» так ці інакш прыходзілася гаварыць як аб надзвычайнай з'яве

ў беларускім вызваленчым руху настолькі выразна, што ўвесь час дзейнасці газеты асэнсоўваўся як перыяд асобнага, нашаніўскага руху. Чаму? Таму што вакол «Нашай нівы» згуртаваўся сапраўдны колер беларускага грамадства, таленавітыя і патрыятычна настроеныя людзі, якія працавалі над нацыянальнай ідэяй і ў далейшым сталі першымі стваральнікамі беларускай дзяржаўнасці, яе віднымі дзеячамі, класікамі маладой беларускай літаратуры. Гэта Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Цішка Гартны (Жылуновіч), Максім Гарэцкі, Язэп Лёсік, Вацлаў Ластоўскі, Язэп Драздовіч, браты Іван і Антон Луцкевічы і інш. Сёння «Наша ніва» рэабілітавана, вернута беларускай гісторыі. Пройдзены і перыяд ідэалізацыі, узвялічвання газеты пасля 1991 г.

Нашаніўцы лічылі найбольш важным у адраджэнні беларускага этнасу вырашэнне праблемы беларускай нацыянальнай свядомасці. Аб чым бы не ішла гаворка, газета зноў і зноў настойліва абвастрала гэту тэму. На яе старонках выказвалася цвёрдая ўпэўненасць у тым, што «само жыццё» павяло кожнага з славянскіх плямён сваёй дарогай. [6, с. 52]. Гэта развіццё прывяло да з'яўлення вялікаросаў і беларусаў як самастойных народаў. У кожнага з іх узнікла свая культура, сваё палітычнае жыццё, безумоўна, на падставе адзінага гістарычнага мінулага. Газета рэзка выступіла супраць заявы «Белорусской жизни» аб тым, што «кожны беларус павінен рускую, ці расейскую культуру лічыць сваёй роднай» і што «сепаратысты» усе, хто «далей развівае сваю нацыянальную душу і нацыянальную культуру». Ні рускія, ні палякі не з'яўляюцца кепскімі для беларусаў нацыямі. Але, цвёрда заяўляе «Наша ніва», развіваць можна толькі сваю культуру.

І ў мінулы час, і ў пачатку XX ст. палякі і рускія аказвалі значны ціск на беларускую культуру, асабліва беларускую мову, што затрымала яе развіццё. Гэта прыводзіла да таго, што вясковыя хлопцы і дзяўчаты, апынуўшыся ў горадзе, праз некаторы час пачыналі саромецца беларускай мовы, пераходзіць хто «у палякі», хто «у расейцы», разрываючы сувязь з месцам, дзе нарадзіліся, і людзьмі, з якімі праводзілі першыя гады жыцця. З мястэчак карэспандэнты паведамлялі, што сярод беларусаў нямала «дурных людзей», якія аддаюць перавагу таму, каб «ламаць свой язык і калечыць польскую або рускую гутарку», але не гавораць пабеларуску (мястэчка Празарокі Віленскай губ.); вакол жывуць бела-

русы, гэты народ «так забіты доўгай няволяй ды панаваннем іншых нацый, што ў іх згубілася саўсем пачуццё патрыотызму, гэта значыць, любві і пашаны усяго вытворэнаго векамі, свайго роднаго. Тутэйшаму чэлавеку здаецца, што ўсё, што сваё беларускае, то гэта кепскае, а ўсё чужое лепшае» (мястэчка Загацце Віцебскай губ.); у Коўна даволі беларусаў, але яны пазбягаюць беларускай гутаркі у штодзённым жыцці, «відаць, баяцца неразумнаго сьмеху тых цёмных людзей, што дагэтуль называюць нашу гутарку «прастой»».

Хто з сялян выбіваўся «у людзі», набываў адукацыю, займаў высокае становішча ў дзяржаве, «той згрузу аддзяляўся ад вёскі», «перастае быць не толькі мужыком, якім радзіўся, але і *беларусам.* Такі чэлавек прылучаецца да чужой (расейскай або польскай) культуры, узбагачываючы яе, працуе не для свайго народу, не для беларускай вёскі, а для расейскай ці польскай” [6, с. 139]. Такім чынам, сяляне-інтэлігенты адрываюцца ад вёскі, якая аддае свае найлепшыя сілы, а сама застаецца «за адвечнай мяжой пагарды». Некаму выражаць душу, выказваць жаданні і волю народа. За яго гавораць чужые людзі, для якіх беларусы, у пэўным сэнсе, толькі матэрыял для сваёй палітыкі.

Цяжкім ярмом, на думку газеты, павісла на шыі беларусаў неадукаванасць, адсталасць, безкультур'е. Па школьнаму перапісу, які быў праведзены 18 студзеня 1911 г., на кожную тысячу чалавек насельніцтва Беларусі прыходзілася вучняў у народных і іншых школах: Віленская губерня – 28, Мінская губерня – 38, Віцебская губерня – 38, Гродзенская губерня – 44, Магілёўская губерня – 52;
усяго пісьменных: Віленская губерня – 29,3%, Гродзенская губерня – 29,1%, Віцебская губ. – 24,6%, Мінская губерня – 17,7%, Магілёўская губерня – 17% [6, с. 436–437**].** Гэта больш чым яскравая карціна амаль усеагульнай непісьменнасці. Карэспандэнты з месцаў паведамлялі, што ў некаторых вёсках цяжка знайсці хаця б аднаго грамацея. У вёсцы Жартай Барысаўскага павета Мінскай губерні з 70 хат у суседнюю, за 5 вёрст, школу хадзілі толькі трое ці чацвёра дзяцей. Вось і ўсе вучоныя людзі ў сяле. «Сколькі працы, – з горыччу ўсклікае аўтар весткі, – ешчэ трэба палажыць на гэту краіну, каб хоць крыху разагнаць цемнату». Царскі ўрад такое становішча беларускага насельніцтва амаль не турбавала. Народны настаўнік з Гродзенскай губерні падрабязна тлумачыў, як цяжка адкрыць ці пабудаваць у вёсцы школу. Мноства інстанцый

патрабавалі, каб просьба была напісана «по форме» і знаходзілі ўсюды памылкі, каб вярнуць паперу для паўторных прашэнняў сялянскага сходу. Яшчэ болей фармальнасцяў і перапіскі патрабавала будаўніцтва дома пад школу. Планіроўка школы не праводзілася, таму, пісаў карэспандэнт, «нашы школы на вёсках горш за загранічные сьвіные хлявы: халодные, сырые, цёмные, цесные, без доступу свежага паветра». Некалькі разоў дэпутаты Дзяржаўнай Думы ад усіх губерняў Беларусі і Літвы збіраліся ў Вільні і прасілі Расійскі ўрад даць грошы на ўніверсітэт у Вільні, але «справа стаіць».

Газета звяртала ўвагу на тое, што сяляне звыкліся з такім жыццём і не вельмі цянуліся да адукацыі. У адным сяле памешчык даў абшчыне дом для школы, дык сяляне запатрабавалі ад яго магарыч за тое, што яны на сельскім сходзе прагаласавалі за яго ініцыятыву. Памешчык аж разгубіўся.

Газета з горыччу паведамляла аб дрэнным культурным становішчы беларусаў. У адным з нумароў «Нашай нівы» быў надрукаваны ліст ад беларуса. У ім былы жыхар аднаго з мястэчак Беларусі апісаў свае ўражанні ад наведвання бацькаўшчыны: «там дзеюцца страшэнные рэчы. Цемната беспрасветная. Газет не выпісываюць (смешна сказаць), баяцца: хто чытае газету, таго староняцца, лічаць небезпечным чэлавекам…інтэлігенты думаюць аб сабе; народные вучыцелі, без мала ня ўсе толькі пьянствуюць, праводзяць ночы за картамі і звысока глядзяць на мужыкоў, с каторых самі выйшлі». Пісьмо мела характэрную назву – «Як ня стыдна?» [6, с. 33]. Беспрасветнасць, цемната, забітасць настолькі ўразілі карэспандэнтаў, што адзін з іх у роспачы ўсклікнуў: «Боже мой, як мы яшчэ далёкі ад культурнага чэлавека! Мы ешчэ, як дзікія людзі, баімся грому і маланкі» [6, с. 396].

Рэдакцыя газеты спрабавала знайсці словы, якія б прабудзілі чалавечы гонар беларусаў, таму часта выкарыстоўвала цёмныя фарбы, ранячыя душу замалёўкі з жыцця простага народу. У адным з артыкулаў сялянскае жыццё параўноўвалася з астрогам, які ўвасабляе сабой «цемнату нашу, праз каторую ніводзін прамень сонейка, ніводная добрая вестка са сьвету шырокага да нас не далятае. За сьцянамі сьвеціць солнца, за сьценамі пяюць птушкі, а ў нас і цёмна, і глуха: нам песьня волі не чутна, мы толькі сохнем і марне-

ем, нам тут радасьці німа» [6, с. 536]. І тут жа змешчаны верш Івана Пісарыка, у якім ёсць такія радкі:

Хоць ты сэрцэ вырві
Дый адкінь далёка,
Бо іначэй жыці
Вельмі мне ня лёгка.
Можэ быць гаротным
Маці урадзіла,
Або мо бездольным
І жыццё зрабіло? [6, с. 539].

Газета параўноўвала становішча спраў у Беларусі з Украінай і Расіяй і прыйшла да несуцяшальнай высновы, што «ураджайнасць нашай зямлі, культура нашаго края, умеласць і працавітасць нашых людзей шмат ніжэйшые чым мы там бачылі…на касьцях пачуеш, што надта дрэнная дарога: рытвіны, ямы, каменьні» [6, с. 613]. І зноў, як рэфрэнам, гучыць заклік да чытачоў «зварухнуцца з мейсца, шчыра заняцца сваей доляй», каб не адстаць ад суседзяў і каб самім сабе палепшыць крыху жыццё.

Рэдакцыя са шматлікай пошты вылучала тыя звесткі з месцаў, дзе прыводзіліся прыклады паляпшэння культуры, дзе праяўляліся яе адметныя беларускія рысы, пры гэтым асаблівая ўвага адводзілася т.зв. беларускім вечарынам. Газета падрабязна апісвала ў іх правядзенні ўсё, што датычылася беларушчыны. Як правіла, вечарына ўключала пастаноўку п'есы, дэкламацыю вершаў, сялянскі хор і на завяршэнні ўсе прысутныя танцавалі. Артыстамі былі простыя сяляне, якія ўваходзілі ў канцэртную групу і гастралявалі па гарадах і мястэчках Беларусі і Літвы. Нумары выконваліся на беларускай ці рускай мовах, а то і на сваеасаблівым змешаным жаргоне. Напрыклад, 23 студзеня 1911 г. беларуская вечарына адбылася ў Вільні: сыгралі п'есу «Ня розумом паноў, а сэрцэм», напісаную на змешанай беларускай і рускай мовах. Пасля дэкламацыі вершаў з «Дудкі беларускай» Ф. Багушэвіча хор сялян спяваў песні па-беларуску і руску. Аўтар весткі, з аднаго боку, радаваўся, што артысты, якія выступалі па-беларуску, «гаварылі сёлета лепей і чысьцей, чым летась», з другога боку, з засмучэннем заўважыў, «што той, хто гэты хор вучыў пеяць, дрэнна зразумеў характар беларускай народнай песьні і гармонізоваў яе на расейскі лад. Таму не гледзячы на тое, што прыехалі «жывые» беларусы-селяне, «бела-

рускага духу на вечары было мала». Але ўсё ж вечарына праходзіла жыва, весела, «публіка увесь час біла у далоні», «усяго на вечары народу было ня менш тысячы душ» [6, с. 59].

Як вядома, у пачатку XX ст., асабліва з 1905 г., актывізавалася музычнае жыццё Беларусі. У многіх гарадах і мястэчках (Мінск, Гродна, Полацк, Слуцк, Копыль, Дзісна, Радашковічы, Празарокі і інш.) узнікалі музычна-драматычныя гурткі, выступаўшыя ініцыятарамі беларускіх вечарын, на якіх у канцэртнай ці тэатралізаванай формах выконваліся народныя песні і танцы, вершы беларускіх паэтаў. Асаблівая роля належала беларускаму музычна-драматычнаму гуртку ў Вільні, статут якога ў канцы сакавіка 1911 г. быў зацверджаны Віленскім губернскім прысутствам. Такім чынам, тутэйшыя беларусы атрымалі сталую базу, дзе можна было збірацца на вечарыны, слухаць і бачыць беларускія пастаноўкі**.** З гэтым гуртком цесна звязана творчасць Л.М. Рагоўскага і І.Ц. Буйніцкага, пра якіх з павагаю пісала газета і якія кожны паасобку і разам шмат зрабілі для станаўлення і развіцця беларускай музыкі, драматургіі, іншых напрамкаў беларускай культуры. Рагоўскі Л.М, польскі кампазітар і дырыжор, склаў «Беларускі песеннік з нотамі для народных і школьных хароў» (1910 г.), ён аўтар балета «Купала», музычнага твора на верш Я. Купалы «А хто там ідзе?» (1910 г.) [9, с. 45].

Буйніцкі І.Ц – беларускі акцёр, тэатральны дзеяч, стваральнік першага прафесійнага нацыянальнага тэатра. Ён часта арганізоўваў вечарыны, адметнай рысай якіх было тое, што на іх гучала беларуская мова, выконваліся знаёмыя простым людзям народныя танцы (лявоніха, юрка, мельнік, гневаш, мяцеліца, верабей), артысты выходзілі ў прыгожай беларускай вопратцы. Развучваць і выконваць народныя песні дапамагаў кампазітар Л.М. Рагоўскі. Стала традыцыяй, што пасля вечарын усе прысутныя з вялікай ахвотай выконвалі беларускія народныя танцы.

5 чэрвеня 1911 г. у Вільні намаганнямі беларускага музычна-драматычнага гуртка была праведзена, як бы сёння сказалі, прэзентацыя – першая беларуская маёўка. Актывісты гуртка з музыкай на чоўнах накіраваліся па р. Вілія за горад і ў лесе дапазна танцавалі і спявалі хорам беларускія песні, вадзілі карагоды. Паглядзець на гэта свята беларусаў сабралася шмат гараджан. Беларусы-гродзенцы таксама праводзілі маёўкі, дзе былі музыка, танцы,

дэкламацыі вершаў. Усё па-беларуску, з гонарам пісала «Наша ніва» [6, с. 254].

Група пад кіраўніцтвам І. Буйніцкага ў канцы чэрвеня 1911 г. арганізавала тры вечарыны ў Капылі, пасля гэтага накіравалася ў Нясвіж, Клецк, Ляхавічы і далей. Газета з энтузіязмам пісала: «Беларусь жыве і ніякія дзікія сілы не стрымаюць ужо яе адрадзеньня». Падкрэсліваючы заслугі І. Буйніцкага ў гэтым абуджэнні беларускага народа, газета шчыра жадала: «Памажы – ж яму Божэ!».

Не пакідала «Наша ніва» без увагі палітычнае становішча ў свеце і на радзіме. Пастаянная рубрыка паведамляла аб найбольш значных падзеях у свеце. Навіны палітычнага і дзяржаўнага жыцця падаваліся ў спакойных, пастэльных танах. Але ўважлівы чытач даволі выразна бачыў пазіцыю рэдакцыі. У кожным нумары выказваліся роздумы пра Дзяржаўную Думу Расіі. Тут мы не знойдзем рэзкай, адкрытай крытыкі Думы, рэдакцыя больш думала, як зрабіць Думу болей карыснай народу. Тут і роспач, і надзеі, і парады думцам. Напярэдадні чарговых выбараў у IV Думу ў 1911 г. газета выказвала думку аб адказнасці дэпутатаў за сваё знаходжанне ў ёй, аб неабходнасці выбіраць у Думу больш прагрэсіўных прадстаўнікоў, а «цёмные сілы не пусьціць у Думу» [6, с. 107].

Аналізуючы работу дэпутатаў беларусаў, газета выказвала незадавальненне імі за тое, што дэпутаты ад Мінскай губерні сядзяць у адным шэрагу з правымі дэпутатамі, знаходзяцца пад уплывам дэпутатаў багацеяў. «Вялікім сорамам» назвала газета правал закона аб земскім самакіраванні ў Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай губернях у Дзяржаўным Савеце [6, с. 157]. Як вядома, Савет Міністраў на чале з П. Сталыпіным увёў земствы ў Заходніх губернях сваёй пастановай, што вызвала незадаволенасць з боку Думы і Дзяржсавета. Па матэрыялам газеты можна судзіць аб тым, што рэдакцыя была за ўвядзенне земскага самакіравання, прычым не толькі ў Заходніх губернях, але і па ўсёй Беларусі, але зрабіць гэта, на яе думку, патрэбна ў прававых рамках, гэта значыць, урад павінен правесці гэты закон праз Думу і Дзяржсавет. Нашаніўцы разумелі, што Расіі вельмі патрэбен прававы парадак. І усё ж яны былі схільнымі да таго, каб пастанова ўрада была праведзена ў жыццё, выказвалі надзею, што «адбудуцца ужо выбары у земство, і яно пачне сваю работу: Дык і Думе і Гасударственнаму Савету ніяк

нельга будзе адпіснуць закон, бо земствы ужо пачнуць працаваць і Дума не адважыцца разбіць іх працу» [6, с. 258].

«Наша ніва» с задавальненнем гаварыла аб земстве, як органе, дзе будуць запраўляць не чыноўнікі, а выбарныя людзі, але адначасова выказвала заклапочанасць, каб туды выбіралі людзей, «што шчыра захочуць і здолеюць працаваць для нашага народу, несучы ў вёску свет навукі і памагаючы ёй устаць на свае ногі…калі ж будзець спаць у шапку, дык і выйдзе, што земство пападзе ў рукі людзей, каторые думаюць не аб карысьці народу, а аб сваей». Гэта засцярога была не безпадстаўнай, тым больш, што афіцыйныя колы пачалі пошук кандыдатаў – беларусаў прарасійскай арыентацыі, каб вясці справы на беларускай зямлі ў інтарэсах царызму.

Газета імкнулася растлумачыць беларускаму насельніцтву, што можа рабіць земства. Галоўнае тут – эканамічнае жыццё народа: развіццё сельскай гаспадаркі, дапамога сялянам заводзіць новыя спосабы гаспадаркі, выдача добрага зерня для пасеву і гаспадарчых прылад, стварэнне пробных палёў і агранамічных школ, друкаванне для сялян кніжак і газет аб гаспадарцы, дапамога развіццю ўсялякіх вясковых промыслаў, навучанне арганізацыі гандлю і азам эканамічнага разліку, будаўніцтва новых дарог і рамонт старых. Земствы, адзначалася ў газеце, будуць самі наймаць урачоў, фельдшараў, акушэрак, адкрываць у вёсках аптэкі і г.д. Асабліва важна, што земствы мелі права адкрываць школы для народа.

“Наша ніва” выказвала ўпэўненасць, што земствы могуць развіваць і сам народ, яго душу і творчасць. Добры прыклад таму давалі земствы, якія ўжо дзейнічалі ў Расіі і Украіне. Але ўсё гэта магчыма, калі мужыкі на выбарах у земствы будуць трымацца дружна і выбіраць, згаварыўшыся між сабой, такіх сваіх прадстаўнікоў, якія цвёрда будуць стаяць за праўду, за свой беларускі народ. Такі вось наказ – інструкцыю змясціла рэдакцыя на старонках сваёй газеты.

На жаль, выбары ў земствы не выклікалі цікавасці з боку беларускага насельніцтва. На павятовыя сходы па вылучэнню выбаршчыкаў або ніхто не прыходзіў, або збіралася «зусім малая жменя людзей». У кастрычніку 1911 г. газета канстатавала, што Мінскае губернскае земства пачало сваю работу, але «работа неяк не надта ладзіцца» [6, с. 523]. Пасіўнасць насельніцтва ў многіх сферах жыцця нярэдка станавілася для «Нашай нівы» прадметам развагі,

няўцешнага абурэння. "Калі хтосьці пісьменны гаворыць сялянам аб іх няшчаснай долі, яны слухаюць, дух затаіўшы, са слязамі на вачах, гаворачы: «Дай Бог здароўя тым людзям, што дзеля нашай будучыны працуюць, што за нас пакрыўджэных, ды за нашу пагарджаную мову заступаюцца!». Але добры чалавек адыходзіць, а людзі зноў прывычна цягнуць сваю лямку, не спрабуючы штосьці змяніць", канстатавала газета. Яна была напоўнена безвыходнай жальбой людзей на сваё жыццё. У адным з нумароў адзначалася: «Цяжкое наша жыццё, чорная наша доля. Ад веку забітые, ад веку загнанные, без навукі, без сьвету мы цягнем, бытцам жывёла, хамут жыцьці, абліваючы потам убогую ніуку, праліваючы кроу на вайне, спраўна ўносячы падаткі, праўляючы павіннасьці, – мы працавітые хлебаробы-беларусы…Беларус цёмен забіт, няшчасны! – так кажэ кожны, хто пазнаў беларускую вёску» [6, с. 198].

Характэрныя весткі дасылалі карэспандэнты з гарадоў і мястэчак Беларусі ў 1911 г.: з г. Полацка: «гарадок наш так заснуў, што сьпіць і не прачыхаецца…Ці-ж бы не знайшлося ў нас хаця бы малой жмені жывых людзей?»; з г. Дзісна Віленскай губерні: «у Дзісны жыццё плыве сонна…кругом поўная мерцьвеччына». Па выніках агляду падобных звестак у асобным артыкуле рэдакцыя дала свой абагульняючы партрэт Беларусі: «Пападзеш у Беларусь, – і песня маркотная, ныдлівая спаткае цябе…чорная, галодная вёска, як голы шкілет, бьець па тваіх нэрвах. Не ўбачыш тут красуні – хаты велікаруса, ні стройнай хаты ўкраінца, Не спаткаеш вясёлай твары, радай з жыцьця… Тут усё настроена на мінорны тон. Тут усё плачэ. На ўсім блішчаць сьлёзы, усё авеяна маркотнасьцю, як туманам. Векамі прыбітая старонка ня змыла сьлёз з сваіх заплаканных вачэй. Апушчэныя рукі вісяць, як бізуны, ад прывычных ланцугоў ня могуць падняцца. Галава панікшая маркотна глядзіць у ніз у зямлю, не важучыся глянуць у верх, на сонцэ, на сіняе небо. Моўчаліў і пануры беларус!

Чаму-ж ты дагэтуль не аглянуўся кругом?

Чаму тваё сэрца не запалілося любоўю да жыцьця?

Чаму не загарэлася ў цябе жаданьне развіцьця?

Чаму ты не стаў тварцом, а астаўся чалавекам, няздольным ісьці усьлед поступу?

Чаму ты зябнеш дагэтуль у цемнаце і за цэлые сталецьця не пасунуўся наперад ні на адзін крок?

Калі-ж ты, у канцы, выйдзеш з дзікаго стану і прымеш образ морзкі?" [6, с. 402–403].

Жаласлівы да слёз малюнак беларускага жыцця дапаўнялі такія ж беспрасветна жалобныя вершы. Вось адзін з іх, напісаны Я. Коласам:

Ты памрэш, цябе не будзе,
Пахаваюць труп на грудзе,
Пры дарозе, на кургане,
Адным крыжам болей стане.
Ураніушы колькі сьлёз.
Аднэй кветкай у нагах
Над Гарбом з зямлі пастылай
Пара вырасьце бяроз.
Над маркотнаю магілай
Цяжкі камень сьцісьне грудзі,
І забудуць скора людзі
Чый пакоіцца тут прах [6, с. 198].

Чаму так змрочна «Наша ніва» малявала жыццё беларусаў? Можна дапусціць, што рабілася гэта з мэтай вызваць у чытачоў унутраны пратэст супраць такога страшэннага жыцця, жаданне выйсці з яго, каб «людзьмі звацца». Таму нярэдка ў тэкстах сустракаюцца такія антонімы, як «цемра» і «свет, сонейка». Да таго ж, газета, напэўна, давала магчымасць беларусам апазнаць сябе ў газетных радках і як бы выплакацца, выгаварыцца ўсяму свету аб сваей долі гаротнай, але адначасова і выклікаць жаданне пазбавіцца ад гэтай долі.

Характэрным у гэтым сэнсе з'яўляецца верш Ф. Чэрнышэвіча, надрукаваны ў «Нашай ніве»:

Гэй, прачынайцеся, сонные людзі!
Стрэньце вы новае жыцце свае:
Доля і радасьць асвежыць вам грудзі!
Сонца устае! [6, с. 236].

Газета не проста выкарыстоўвала змрочныя фарбы, але і імкнулася нагадаць беларусам, што яны народ, нічуць не горшы за іншыя народы. Набліжаецца час, калі «беларусы ў сям'і братніх народаў перастануць лічыцца пасынкамі, калі счэзне апошняя спадчына паншчыны – пагарда да сваёй нацыі». Але патрэбна страсянуцца, падняць вочы ад зямлі да неба блакітнага, пазбавіцца

ад бядотны і цемры. Газета ўпэўнена сцвярджае: «Нацыянальнае адраджэньне беларускага мужыцкаго народу ўжо началося. Мужык пачуў сябе *чэлавекам,* чэлавек – беларусам» [6, с. 101].

На працягу ўсяго 1911 г. газета з горыччу, але рашуча выступала супраць бяды, ўкараніўшайся ў жыццё народа – п'янства, карцёжнай гульні і вынікаючых з іх наступстваў: «дзе карты, там без гарэлкі не бывае, а дзе гарэлка, то і да бойкі недалёка», на кірмашах найбольш часта бываюць п'янства і бойкі. Купілі што – п'юць барыш, наймаюць на работу – барыш, госць ці знаёмы – трэба гарэлка, радзіны, хрэсьбіны ці пахаванні – і там без гарэлкі не абыйдуцца людзі. «Хлопцы грамадой усцягнулі і спусцілі з гары такую грамадзіну – паравік для млына. Атрымалі 7 рублёў, каторые панесьлі да карчмы, дзе і прапілі». Манаполька і шынкі падчас судоў і сходаў ніколі не бываюць зачынены [6, с. 61].

Газета пісала, што ў гарадах амаль у кожнай хаце шынок, дзе прадаюць гарэлку на вынас, ды і на месцы п'юць да апошняй капейкі. У мястэчку Крэва сяляне і ганчары прапіваюць у нядзелю ўсе заробленыя за тыдзень грошы. На земскім сходзе прынялі «прыгавор»: забараніць прадаваць гарэлку і піва ў шынках [6, с. 189]. Цяжка сказаць, колькі часу пратрымаўся гэты «прыгавор», але яго прыняцце мужчынскім сходам само па сабе гаворыць, што п'янства дапякло жыхароў. Тое ж зрабілі і сяляне вёскі Гарасімёнкі Магілёўскай губерні. Газета растлумачвала, што беднасць і цемната народа не ад малых заробкаў, а ад таго, што амаль палова заробленых грошай траціцца на гарэлку і асноўныя даходы ідуць гандлярам гарэлкай, а не працоўным людзям.

Карэспандэнт з горыччу паведамляў з мястэчка Германавічы Дзісненскага павету аб тым, што з адкрыццём у мястэчку кірмашоў «п'янство пачало разрастацца, патайных шынкоў развялося больш, чым трэба…цяпер нечувалае разрастаецца п'янство ў кожнай хаці. П'юць усе, і дзеці і дарослые, і мужыкі і бабы, а пьючы гэтак прапіваюць і розум, і здароўе, і дастаткі свае. У канцы праз колькі год наша вёска дойдзе да поўнай руіны пры гэткіх парадках» [6, с. 301]. Такая ж скарга прагучала з мястэчка Росіца Дрысенскага павету: «Як толькі ў нас кірмаш, дык так і ведай, што, напіўшыся гарэлкі, каго-небудзь ці насмерць забьюць, ці набьюць добра…Цёмные людзі! Калі ж вы прасьвятлееце, калі перастанеце піць гарэлку – тую атруту, с каторай выходзіць усё благое?» [6]. Газета выказвала

шкадаванне, што ўсюды, як грыбы пасля дажджу, вырастаюць па Беларусі рэстараны, піўныя «і іншые гэтага калібру «культурных» заканурках, чым школ ці хаўрусоў». Тое ж, што і бацькі, робяць маладыя: «п'яніцы, разбойнікі, ды ўсё народ цёмны», «за гарэлку ў нас усё робіцца: і сьветам наймаюць, і важнае начальства выбіраюць, і судзяць». Пры гэтым у спайванні насельніцтва адчуваўся яўны эканамічны інтарэс царскай улады. Аналізуючы дзяржаўныя даходы Расіі, газета падкрэслівала, што большую іх частку складаюць грошы простага народу: «Вядома, што гарэлкі найбольш выпіваюць селяне, а на гэтым казна зарабляе многа грошай, бо прадаюць гарэлку шмат даражэй, чым каштуе» [6, с. 276].

Газета настойліва сцвярджала, што беларусы – працавітая хлебаробная нацыя, якая заслугоўвае і можа быць шчаслівай, трэба толькі абудзіць у сабе нацыянальную самасвядомасць. У 50-ю гадавіну адмены прыгоннага права газета з гонарам нагадвала, што думкі аб ганебнасці і сораму гэтай няволі авалодвалі лепшымі людзьмі і ў нашым баку. Такія «светлые людзі», як Храптовічы, Бжастоўскія і іншыя ўжо сто гадоў таму вызвалілі сваіх сялян ад прыгону, а ў 1818 г. на сходзе шляхты Віленскай губерні маршалак Завіша горача выказаўся аб патрэбе скасавання прыгону, за што губернатар атрымаў ад цара вымову. Многія цяжкасці беларусаў ад таго, што «народ наш цёмны, бо мы самі не ведаем, хто мы такіе, бо мы саромяемся сваей мовы і пагарджаем ёю!» [6, с. 405]. На сваіх старонках газета настойліва патрабавала, каб беларуская мова гучала і ў школе, і ў касцёле, і ў царкве: “Хопіць беларусам пазнаваць веды і боску малітву з чужой мовы”. Беларускі нацыянальны рух – гэта вялікая культурная работа, якую трэба развіваць штодзённа. Газета выказвала ўпэўненасць, што «у нашым народзі есць вялікая жывая сіла, каторая перэховывалася доўга ў забытых Богам і людзьмі вёсках у душы беларускіх хлебаробаў і вось цяпер яна рвецца на вольны сьвет» [6, с. 324].

К гонару «Нашай нівы», яна ніколі не прыніжалася перад уладай, а настойліва выкрывала і асуджала намаганні царызму па русіфікацыі беларускага краю. Тое, што рэдакцыя рабіла гэта спакойна, без нацыяналістычнай гарачнасці ці рэвалюцыйнай нецярплівасці, было яе не слабасцю, а той сілай, якую ўспрымалі ўсе: і багатыя, і бедныя, і паны, і сяляне, і каталікі, і праваслаўныя, і інтэлігенцыя – ўсе, кто зберагаў у глыбіні сваёй душы беларушчы-

ну, хто марыў і штосьці рабіў, каб нацыянальнае беларускае самавызначэнне здейснілася ў адраджэнні беларускай самасвядомасці, «калі кожны селянін з гордасцьцю назаве сябе не «тутэйшым», а *беларусам*» [6, с. 166].

Газета распавядала, што царызм сваю нацыянальную палітыку ў Беларусі накіроўваў на тое, каб знішчыць усё беларускае, а «беларусаў перэрабіць на велікарусаў». «Наша ніва» выкрывала дзейнасць праўладных выданняў, напрыклад, “Віленскага весніка”, “Белорусскай жизни”, якія баранілі ўсю палітыку царскага ўрада ў беларускім краю, асвятлялі тутэйшыя справы, «як прыкажуць». «Гэтак і Беларусь у іх – не Беларусь, а «искони русский край», заходняя «окраина», дый беларусы – зусім не беларусы, бо такіх няма». Намаганнямі царызму «так і жыве нейкім калечаным жыцьцём наш край» [6, с. 595].

Газета рэгулярна дапамагала сялянам падымаць сваю бытавую і гаспадарчую культуру. Яна падрабязна апісвала, напрыклад, як зберагчы летам лёд у склепах, як парыцца ў лазні, як даглядаць за бульбай у полі, як рабіць кампост, гадаваць дзяцей і г. д.

«Наша ніва» пакінула выключна значны след у беларускай гісторыі, яе грамадскім жыцці. Яе погляд быў накіраваны на ўсё, што знаходзілася ў беларускім краі. Яна ведала і разумела шматлікія супярэчнасці жыцця беларусаў. Але за ўсім гэтым непахісна стаяла галоўная мэта – адраджэнне Беларусі. Адраджэнне ў самым шырокім плане: нацыянальнае, культурнае, закранаючае і мову, і бытавыя норавы, і гаспадаранне, і добраўпарадкаванне гарадоў і мястэчак, накіраванае на прабуджэнне нацыянальнай свядомасці ва ўсіх пластах насельніцтва. Беларускі народ доўгі час знаходзіўся «у **паўсне** нацыянальнай несвядомасці», не адмаўляўся ад свайго асабістага імя, свайго духоўнага быцця, хаця канкрэтна не **праяўляў** усяго гэтага, жыве ім унутрана ў сваім шэрым будзённым жыцці, не адмаўляўся ад сваіх казак, звычаяў, мовы» [8, с. 184], Газета верыла, што селянін–хлебароб з'яўляецца кладзезем глыбока схаванай сапраўднай беларушчыны. З яго пачынаецца адраджэнне Беларусі, ахопліваючы ўвесь беларускі народ. Барацьба «Нашай нівы» за гэтыя мэты была паслядоўнай, спакойнай, але цвёрдай і бескампраміснай. Гэта і значыла, што «Наша ніва» стала цэнтрам адраджэнцкіх намаганняў перадавых людзей Беларусі, што ў кан-

чатковым выглядзе прывяло да стварэння сувярэннай беларускай дзяржавы.

Выкарастаная літаратура

1. Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. Т. 11. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2000. – 560 с.

2. Дыскусія аб «Нашай ніве». Вып. II. – Менск: Дзярж. Выдавецтва Беларусі. Партсэктар, 1932. – 104 с.

3. Ермаловіч М. Слова пра «Нашу ніву» // Полымя. 1990. – № 2. – 166-169 с.

4. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2-х ч. Ч. I. / рэдкал.:М.П. Касцюк (гал. рэд. [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1994. – 527 с.

5. Наша ніва. – 1910. – № 27.

6. Наша ніва. Першая беларуская газета з рысункамі. Вып. 4. 1911 г. Факсімільнае выданне. Вільня.

7. Студзенка Т. «Наша ніва» (1906-1915) і яе чытач: вытокі яднання // Беларуская думка. – 2010. № 1. – С. 110-115.

8. Шантырь Ф. Потребность национальной жизни для белорусов и самоопределение народа // Деды: дайджест публикаций о белорусской истории. Вып. 11. – Минск: Харвест, 2013. – 328 с.

9. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэдкал. Г. Пашкоў (гал. рэд. [і інш.]. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993–2003. – Т. 6. Кн. 1. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2001. – 592 с.

## ДЗЕЙНАСЦЬ МАСОНСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ НА БЕЛАРУСКА–ЛІТОЎСКІХ ЗЕМЛЯХ У ПАЧАТКУ XX СТ.

Багалейша С.В.,г. Мінск, БНТУ

Гісторыя масонскіх ложаў і іх роля ў развіцці нацыянальнай ідэі і нацыянальнага адраджэння пакуль нячаста была аб’ектам увагі беларускіх даследчыкаў. Але прыцягвае ўвагу сам факт існавання таямнічых ложаў на тэрыторыі Беларусі. Трэба адзначыць, што непасрэднае дачыненне да віленскага масонства мелі вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху: Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Іван Краскоўскі і інш. Шматлікія кантакты паміж беларускімі, літоўскімі і яўрэйскімі дэмакратамі Віленшчыны адбываліся на паседжаннях масонскіх ложаў. У